*Таццяна Бабіч*

## АРЭХАЎСКІ ГУРТ «ЖЫТНІЦА»: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Народная культура Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці непаўторная і надзвычай разнастайная. Натуральным асяродкам яе існавання з'яўляецца вёска. Да гэтага часу яна застаецца крыніцай пераемнасці каранёвых форм мыслення і паводзін беларусаў, фарміравання нацыянальнага характару чалавека, скарбонкай народных традыцый. Своеасаблівай музычнай «візітоўкай» Клічаўшчыны сёння з'яўляецца ансамбль народнай музыкі і песні «Жытніца» Арэхаўскага сельскага Дома культуры. Створаны ансамбль у 1991 годзе, а ў 1994 атрымаў ганаровае званне «народны аматарскі калектыў».

Удзельнікамі гурта з'яўляюцца настаўнікі Арэхаўскай дзіцячай школы мастацтваў, супрацоўнікі ўнітарнага камунальнага гаспадарчага прадпрыемства (УКГП «саўгас Дабраволец»), выхавацелі дзіцячага садка, вучні Пярэкальскай сярэдняй школы. У пэўным сэнсе калектыў «Жытніца» можна назваць сямейным ансамблем. Кіруюць ім муж і жонка – Уладзімір Георгіевіч і Алена Міхайлаўна Ваакс, а іх старэйшы сын Арцём з'яўляецца салістам-спеваком і скрыпачом ансамбля, а самы малодшы ўдзельнік у калектыве – сын Георгій. Увогуле ў складзе гурта чатыры сямейныя пары і іх дзеці. У 2005 годзе на абласным фестывалі сямейнай творчасці «Суквецце талентаў» у Глуску «Жытніца» атрымала гран-пры, а ў 2008 годзе стала дыпламантам Міжнароднага фестывалю сямейнай творчасці «Палярныя зоркі» ў Мурманску.

На пачатку сваёй творчай дзейнасці гэта быў выключна спеўны ансамбль, аднак з цягам часу павольна склалася і вялікая інструментальная група, у якую ўвайшлі наступныя інструменты – баян, скрыпка, цымбалы, беларуская дуда, акарына, дудкі, жалейкі, колавая ліра, а таксама балалайка, балалайка-бас, барабан, бубен, шумавыя інструменты. Трэба адзначыць, што сам кіраўнік гурта, Уладзімір Георгіевіч, – вядомы народны майстар, які займаецца аднаўленнем традыцыі вырабу старажытных беларускіх народных інструментаў – колавай ліры, дудак, сурмаў і інш.

Першыя гады дзейнасці гурта былі часам пошуку свайго творчага аблічча і арыгінальнага рэпертуару. Творчая праца ансамбля вылучаецца наватарскімі пошукамі: традыцыйныя вытокі спеўнай і інструментальнай культуры спалучаюцца з сучаснымі тэндэнцыямі. Кіраўнікі калектыва ставяць на мэце папулярызацыю спрадвечных народных музычных традыцый Беларусі сярод сучаснага мясцовага насельніцтва (асабліва моладзі), захаванне беларускай нацыянальный музычнай культуры. Вынікам менавіта творчага эксперымету з'яўляецца рознажанравы і рознахарактарны рэпертуар, які складаюць беларускія народныя песні ў арыгінальнай інструментоўцы («Заездзіў я коніка», «Ляснік», «Пад калінаю», «Прымакі»), аўтарскія творы У.Г. і А.М. Ваакс («Кірмаш», «Талака», «Родны край», «Грай дуда»), найгрышы («Вянок беларускіх танцаў»), а таксама традыцыйныя каляндарна-абрадавыя, прывітальныя, сямейна-побытавыя песні і вясковыя побытавыя танцы Магілёўшчыны і памежных з Клічаўскім раёнаў.

Усе канцэрты «Жытніцы» маюць вялікі поспех, а жыхарам Магілёўскай вобласці гэты калектыў успадобіўся за традыцыйнае і адначасова арыгінальнае гучанне народных мелодый, нестандартнасць музычнага вырашэння і непаўторны каларыт. Калі патрэба, «Жытніца» выступае і на святочных канцэртных пляцоўках, і ў полі падчас жніва. І гэта – сведчанне знітаванасці яго ўдзельнікаў з вясковым ладам жыцця, пацвярджэнне таго, што званне «народны» сапраўды адпавядае статусу калектыва. Акрамя роднай Магілёўшчыны, ансамбль шмат гастралюе па Беларусі і за яе межамі – у Расіі, Латвіі, Эстоніі, Малдове, Аўстрыі. Гэтым ён робіць значны ўнёсак ва ўмацненне культурных сувязей паміж народамі, папулярызуе беларускае народнае мастацтва па-за межамі краіны. Ансамбль з'яўляецца лаўрэатам і дыпламантам шматлікіх міжнародных фестываляў, сярод якіх фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах (1999), фестываль «Вянок дружбы» ў Бабруйску (2005, 2007), фестываль сямейнай творчасці «Палярныя зоркі» ў Мурманску (2008), фестываль народнай музыкі ў Петразаводску (2009) і інш. Калектыў актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх, абласных і рэгіянальных народных святах і арт-праектах, сярод якіх свята-конкурс народнай творчасці «Беларусь – мая песня» ў Мінску (2005) і «Народная прыпеўка» ў Слаўгарадзе (2004, 2006), тэлефестываль «Залатыя ключы» ў Салігорску (1999) і інш.

Асобнай увагі заслугоўвае даследчыцкая праца заснавальнікаў і ўдзельнікаў «Жытніцы». Удзельнікі ансамбля выязджаюць у творчыя і этнаграфічныя экспедыцыі па Клічаўскаму, Кіраўскаму, Бабруйскаму раёнам Магілёўскай вобласці з мэтай пошуку ўзораў народнага мастацтва. Яны вывучаюць традыцыйную абрадавую культуру свайго краю, запісваюць песні, інструментальныя найгрышы ад сталых носьбітаў мясцовай традыцыі. Потым вынікі экспедыцый становяцца часткай рэпертуару калектыва.

Шмат гадоў ансамбль падтрымлівае творчыя сувязі з беларускімі дыяспарамі Расіі, Латвіі, Малдовы, Аўстрыі. Яго добра ведаюць беларусы замежных краін. Менавіта па яго песнях, найгрышах і танцах большасць з іх падтрымлівае сувязь з культурай сваёй гістарычнай радзімы.

Вялікую ўвагу надае «Жытніца» перайманню фальклору дзецьмі і моладдзю Магілёўшчыны. З 2004 пры калектыве дзейнічае дзіцячы ансамбль-спадарожнік «Каласок», кіраўніком якога з'яўляюцца Уладзімір Георгіевіч і Алена Міхайлаўна Ваакс.

Творчая дзейнасць «Жытніцы» скіравана на забеспячэнне пераемнасці духоўных і мастацкіх традыцый беларускай вёскі, фарміраванне нацыянальнай і патрыятычнай самасвядомасці праз далучэнне сучаснай моладзі да багатай культурнай спадчыны сваёй роднай бацькаўшчыны.